WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЖНІЎНЯ 2011 г. ПЯТНІЦА
№ 162 (27026)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «СІТУАЦЫЯ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СТАБІЛІЗАВАНА ПРАЗ ПАЎТАРА-ДВА МЕСЯЦЫ»

**Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе аб актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, перадае БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што на наступным тыдні будзе канчаткова вызначаны эканамічны курс далейшага развіцця краіны. «Сёння на падставе прапрацоўкі пытанняў на гэтай нарадзе мы вызначым курс. Далей цягнуць нельга. Да аўторка-серады ўсё гэта будзе зведзена ў адзіны дакумент і вынесена на ўзровень Прэзідэнта, і я асабіста аб'яўлю людзям, як будзе дзейнічаць урад і Нацбанк у гэтай сітуацыі».

«Паўтара-два месяцы ў нас на стабілізацыю сітуацыі на валютным рынку. Поўнасцю! — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Каб насельніцтва ўжо не проста слухала і верыла або не верыла, а адчула, што курс, які вызначаны, будзе дзейнічаць і ў далейшым, і сітуацыя будзе развівацца ў тым напрамку, у якім будзе абазначана Прэзідэнтам».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што цяперашняя нарада павінна паслужыць канчатковай выпрацоўцы курсу дзеянняў на бліжэйшы час і паўплываць на далейшую стратэгію. «Катастрофы няма, сітуацыя кантралюемая, але патрабуе прыняцця пэўных рашэнняў», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што павінны быць прыняты рашэнні, заснаваныя на аб'ектыўных эканамічных законах. «Мне патрэбны выверапыя прапановы з аналізам станоўчых і адмоўных наступстваў, а не пераказ пастулатаў з падручнікаў па эканамічнай тэорыі. Усе рашэнні павінны быць заснаваны на аб'ектыўных эканамічных законах, якія дзейнічаюць незалежна ад таго, хочам мы гэтага ці не. Ніякага папулізму быць не павінна». Прэзідэнт падкрэсліў, што краіне трэба выходзіць на нармальны ўзровень функцыянавання валютнага рынку. «Мы дамаўляліся, 10-12 дзён таму, каб у спакойным рэжыме прапрацаваць усе варыянты нашай тактыкі і стратэгіі дзеянняў у бліжэйшы час, каб стабілізаваць валютны рынак, і нават не стабілізаваць, ён стабілізаваўся на нейкім непрымальным для нас узроўні. Нам трэба выходзіць на нармальны ўзровень функцыянавання валютнага рынку», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што за студзень—чэрвень 2011 года паступленне валютнай выручкі дасягнула свайго гістарычнага максімуму і склала звыш $20 млрд. Гэты паказчык перавышае аналагічны ў самым паспяховым, дакрызісным 2008 годзе больш як на $2 млрд. «Такога прытоку валюты краіна яшчэ не ведала», — адзначыў Прэзідэнт. Акрамя таго, паводле яго слоў, эканоміка Беларусі развіваецца даволі паспяхова, што прызнаецца ўсёй сусветнай супольнасцю. Рост ВУП за 7 месяцаў 2011 года склаў амаль 110 працэнтаў, выкананы большасць параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, тэмпы росту экспарту тавараў за першае паўгоддзе гэтага года склалі амаль 170 працэнтаў і перасягнулі тэмпы росту імпарту на 9 працэнтаў, што таксама ўпершыню. У той жа час Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нават такія паказчыкі не даюць магчымасці мець сёння дастаткова валюты, каб будаваць сваю палітыку на валютным рынку і стабілізаваць сітуацыю.

### Уклады насельніцтва замарожвацца не будуць

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што для гэтага няма ніякай неабходнасці. «Мы на гэту меру не пойдзем, яна нам не патрэбна». «Пачынаюць зноў нам падкідваць гніллё, пятая калона наша, ды і з-за межаў, маўляў, заўтра-паслязаўтра пачнуць замарожваць уклады. Вось чаго я вам не раю рабіць і катэгарычна забараняю, дык гэта гэтага».

«Ніякага замарожвання ўкладаў насельніцтва. Нам няма неабходнасці гэта сёння рабіць. Ніякай неабходнасці — гэта ж нічога не дасць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён таксама адзначыў, што думак аб гэтым няма, як гэта сведчыць з даклада старшыні Нацбанка. «Значыць, нам пачынаюць гэту ідэю падкідваць для таго, каб узбудзіць насельніцтва», — лічыць Прэзідэнт. Ён зноў адзначыў: «Хачу, каб насельніцтва разумела: мы на гэту меру не пойдзем, яна нам не патрэбна».

### У Беларусі прадоўжыцца індэксаванне дапамог, пенсій, стыпендый і зарплат

«І хоць нас крытыкуюць за тое, што мы павялічылі пенсіі і індэксавалі зарплаты, але такая палітыка неабходна, і яна будзе прадоўжана», — сказаў кіраўнік дзяржавы. На думку Прэзідэнта, рост цэн не такі страшны, паколькі гэтыя грошы ўсё роўна так ці інакш застануцца ў прадпрыемстваў. Значна важней — ці хапае грошай у насельніцтва для таго, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю, ці створаны ў краіне ўмовы для таго, каб насельніцтва магло зарабіць гэтыя грошы. «Ці здольна насельніцтва пры тым, што мы маем добры аб'ём вытворчасці малака і мяса, іншых прадуктаў, сёння нармальна харчавацца? Ці хапае ў насельніцтва для гэтага грошай? Я не гавару пры гэтым, што трэба выкінуць мноства грошай, як гэта было раней. Грошы трэба зарабіць. Але ці стварылі мы ўмовы для таго, каб чалавек мог зарабіць столькі грошай, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю», — сказаў ён. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада далажыць, ці ўсе рычагі сацыяльнай падтрымкі насельніцтва задзейнічаны, і ў першую чаргу — малазабяспечаных грамадзян.

### Прэзідэнт патрабуе разабрацца з ростам цэн

Такую задачу ён паставіў учора на нарадзе аб актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

«Цэны растуць. Ці не хаваецца за гэтым усёдазволенасць мясцовых улад і кіраўнікоў асобных прадпрыемстваў, якія прыкрываюцца дыспарытэтам цэн з Расійскай Федэрацыяй?» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў ад урада далажыць, якія меры прыняты па стабілізацыі спажывецкага рынку. Прэзідэнт адзначыў, што цяпер ідзе шмат размоў наконт вывазу тавараў у Расійскую Федэрацыю. Аднак, паводле яго слоў, у краіне пастаянна ажыццяўляецца маніторынг, які сведчыць, што вываз спажывецкіх тавараў крыху скарачаецца. «Таму гаварыць аб тым, што прыйшлі і ўсё забралі, не даводзіцца. Мы знаходзімся ў адзінай эканамічнай прасторы з Расійскай Федэрацыяй, ды і ўкраінская граніца ў нас не на замку. У нас адкрытая эканоміка, закрыем мы камусьці — закрыюць заўтра і нам. Таму гаварыць аб тым, што заўтра паўстане ланцугом міліцыя або пагранічнікі з мытнікамі на граніцы і нікога не пусцяць — гэта поўнае глупства», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзейнічаць трэба толькі эканамічнымі метадамі.

### Кіраўніцтва Беларусі мае намер штотыдзень інфармаваць насельніцтва аб эканамічнай сітуацыі і дзеяннях, што прадпрымаюцца

«Нічога ў тайне трымаць не трэба, нават калі гэта будзе непрыемна», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Мы сёння вызначымся, хто будзе штотыдзень або два-тры разы на тыдзень пры неабходнасці праводзіць брыфінгі і інфармаваць насельніцтва аб нашых дзеяннях».

«Я смела аб гэтым гавару, таму што нармальна працуе эканоміка, усе людзі заняты, беспрацоўе ніжэйшае, чым калі-небудзь, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Сёння ёсць усё для таго, каб зарабіць, вывесці эканоміку на належны ўзровень, збалансаваць валютны рынак і захаваць краіну».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ва ўсіх прысутных на нарадзе было дастаткова часу падрыхтавацца як у плане асэнсавання негатыўных тэндэнцый, так і ў плане выпрацоўкі ўзгодненай пазіцыі. Прэзідэнт закрануў таксама і сітуацыю з вяртаннем валютнай выручкі ў краіну. «Некаторыя пачалі ўжо сваволіць. Дзесьці выручку пакінем, нам так выгадна і гэтак далей», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што адпаведнае даручэнне па вывучэнні сітуацыі было дадзена Камітэту дзяржаўнага кантролю і сілавым структурам. «Калі такія факты будуць выяўлены — мала не здасца».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Дарога на «Дажынкі»



Маладыя жыхаркі Маладзечна на фоне гарадской перабудовы.

## 13,3% З ДАХОДАЎ СЯМ'І ПЕНСІЯНЕРАЎ ПРЫПАДАЕ НА АПЛАТУ «ДВУШКІ»

**Як паведаміў начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль ШАГУН, асноўныя віды работ па падрыхтоўцы да асенне-зімняга ацяпляльнага сезона альбо завершаны, альбо знаходзяцца на стадыі, блізкай да завяршэння.**

Асобныя праблемы ёсць з заменай цеплавых сетак (на сёння заменена 348 км, што складае усяго толькі 47 працэнтаў ад гадавога задання). Гэта звязана з сітуацыяй на эканамічным рынку краіны, павелічэннем кошту камплектных частак, якія вырабляюцца за мяжой. У Беларусі створаны рэзервовы запас паліўнага мазуту.

Ужо нарыхтавана 888 тысяч шчыльных кубічных метраў драўнянага паліва (70 працэнтаў ад запланаванага). Стварэнне запасаў драўнянага паліва, па словах Анатоля Шагуна, дазволіць спакойна сябе адчуваць на працягу ўсяго ацяпляльнага перыяду. У сталіцы 100 працэнтаў жылых дамоў падрыхтаваны да ацяпляльнага перыяду.

Пытанне журналістаў наконт таго, ці будуць павышацца плацяжы за камунальныя паслугі, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі пакінуў без адказу, спасылаючыся на тое, што пакуль не валодае такой інфармацыяй.

Па яго словах, удзельная вага аплаты паслуг ЖКГ за сярэднестатыстычную «двушку» (плошчай у 48 квадратных метраў) у даходах сям'і з двух пенсіянераў складае 13,3 працэнта, сям'і работнікаў бюджэтнай галіны — 8,3, работнікаў, якія атрымліваюць сярэднюю зарплату ў рэальным сектары эканомікі — 6,9. Гэтыя паказчыкі (з улікам павышэння коштаў у энергетычным сектары ў красавіку 2011 года) крыху ніжэйшыя за ўзровень студзеня 2010 года. Як заўважыў Анатоль Васільевіч, у сярэднім за апошнія гады паказчык па долі выдаткаў на паслугі ЖКГ у прыбытку сям'і з двух пенсіянераў складае 16-17 працэнтаў, работнікаў бюджэтнай сферы — 10-11 працэнтаў, работнікаў рэальнага сектара эканомікі — 9-10 працэнтаў.

Дарэчы, па яго словах, пагаршэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне не адбілася павелічэннем запазычанасцяў пры аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі. Колькасць даўжнікоў істотна не павялічылася. Большасць пратэрмінаваных запазычанасцяў за жыллёва-камунальныя паслугі — тэрмінам да трох месяцаў. Як правіла, яны дастаткова хутка пагашаюцца.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ДА 1 ВЕРАСНЯ БУДЗЕ АБ'ЯЎЛЕНА АБ ДАЛЕЙШАЙ СТРАТЭГІІ ДЗЕЯННЯЎ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ БЕЛАРУСІ»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 25 жніўня правёў рабочую сустрэчу са старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзеяй Ермаковай.**

«Зусім нядаўна мы абяцалі людзям, што на працягу жніўня, калі ў нас з'явіцца дастаткова інфармацыі і падстаў, мы прымем канчатковае рашэнне аб далейшай тактыцы і стратэгіі нашых дзеянняў на валютным рынку краіны, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Жнівень заканчваецца. У нас засталося зусім нямнога часу для таго, каб такое рашэнне прыняць. Для гэтага ў нас ёсць усе неабходныя падставы».

Паводле слоў Прэзідэнта, ён даручаў Надзеі Ермаковай на працягу 10 дзён прапрацаваць варыянты далейшых дзеянняў, зыходзячы з аб'ектыўных эканамічных і фінансавых законаў, і прапанаваць гэтыя варыянты для прыняцця рашэння. «Таму апошні тэрмін — 1 верасня, а дакладней, вечар 31 жніўня, — мы павінны паведаміць людзям аб нашай тактыцы і стратэгіі ў гэтым напрамку», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы паведаміў, што за апошні час быў праведзены шэраг сацыялагічных даследаванняў сярод розных слаёў насельніцтва. «Вы ведаеце, народ аж пішчыць, няхай ён мне прабачыць гэта, хоча адзінага курсу і свабоднага доступу да валюты, асабліва ў Мінску».

«Зразумела, мы не маем права не рэагаваць на настроі насельніцтва. Вы маю палітыку адносна гэтага ведаеце. Усё мы павінны рабіць для насельніцтва, і мы гэта зробім. Але яшчэ раз папярэджваю, што ўсё павінна быць заснавана на аб'ектыўных эканамічных і фінансавых законах», — сказаў Прэзідэнт.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што многія спецыялісты, у тым ліку кітайскія, папярэджвалі аб неабходнасці акуратнага абыходжання з валютай і недапушчальнасці раскідвацца ёю. «Але, тым не менш, мы павінны дзейнічаць так, як хоча насельніцтва нашай краіны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, яшчэ раз падкрэсліўшы, што пры гэтым неабходна зыходзіць з дзеяння аб'ектыўных эканамічных законаў.

Прэзідэнт папрасіў Надзею Ермакову прадставіць свае ацэнкі сітуацыі і далажыць аб тым, што адбываецца на валютным рынку. «Я інфармаваны ў агульных рысах аб сітуацыі. Тое, што яна стабілізавалася на нейкім узроўні — гэта ўжо нядрэнна. Але якія вы бачыце расткі, якія тэндэнцыі сёння? Таму што зыходзячы з гэтага, нам трэба будзе прымаць рашэнне», — рэзюмаваў беларускі лідар.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### ПАДЗЕННЕ КОШТАЎ НА ЗОЛАТА СТАЛА РЭКОРДНЫМ З 1980 ГОДА

**За два дні кошт золата ўпаў на рэкордныя за тры дзясяткі гадоў $160 за тройскую унцыю, піша Financial Times.**

Кошт наяўнага золата ўпаў да $1750,55 за тройскую унцыю ў параўнанні з гістарычным максімумам у $1911,46, які быў дасягнуты ў аўторак. Апошні раз рэкордны абвал цэн на золата быў зафіксаваны ў студзені 1980 года. У пераразліку на працэнты падзенне за апошнія два дні склала 8,4 %. Золата даражэе з пачатку месяца, асноўная прычына такой тэндэнцыі — асцярогі наконт эканамічнай стабільнасці ЗША пасля зніжэння агенцтвам Standard & Poor's рэйтынгу краіны з найвышэйшай ступені надзейнасці AAA да AA + з «негатыўным» прагнозам, а таксама нестабільнасць Еўропы. З-за эканамічных праблем у ЗША і еўразоне інвестары лічаць золата самым надзейным укладаннем.

**Кар. «Звязды».**

Ведай нашых!

## ПРАЗ ДВА ГАДЫ БАТЭ ВЯРТАЕЦЦА Ў ЛІГУ ЧЭМПІЁНАЎ

### За «Штурм» Анатоль Капскі паабяцаў камандзе 1 930 000 еўра

**БЕЛАРУСКІ БАТЭ паўтарыў поспех 2008 года і ў другі раз выйшаў у групавы этап Лігі чэмпіёнаў. Да нас зноў завітаюць гранды сусветнага футбола, а пакуль яшчэ раз узгадаем, якім няпростым быў шлях да поспеху.**

Хатняя нічыя са «Штурмам» азмрочвалася забітым гасцямі голам, які менавіта ім і даваў перавагу. Нулі на табло ў другім матчы былі б на карысць аўстрыйцаў. Становішча БАТЭ ўскладняла і адсутнасць некалькіх ключавых гульцоў: траўмаваных апорніка Ліхтаровіча і паўабаронцы Паўлава, а таксама абаронцы Шытава, які напярэдадні перайшоў у маскоўскае «Дынама». Плюс апошнія вынікі ва ўнутраным чэмпіянаце, дзе ў трох апошніх турах БАТЭ не ведала перамог, наводзіла на думкі, што ў камандзе пачалася чорная паласа. І хоць Віктар Ганчарэнка быў настроены аптымістычна, хто ведаў, што хавалася за гэтым знешнім спакоем.

СТАР. 8



Футбалісты БАТЭ ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск».

Фота БЕЛТА.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ФРАНЦЫІ ЎХВАЛЕНА ПРАГРАМА ЖОРСТКАЙ ЭКАНОМІІ — ЗА КОШТ ТЫХ, ХТО ПАЛІЦЬ І П'Е



**Францыя ўхваліла шэраг жорсткіх захадаў па барацьбе з бюджэтным дэфіцытам. Скарачэнне дзяржвыдаткаў складзе больш за 16 мільярдаў долараў.**

Праграма таксама прадугледжвае павышэнне падатку для кампаній і асоб, якія працуюць звышурочна, а таксама трохпрацэнтнае павышэнне падатку на высокія прыбыткі (больш 500 тысяч еўра ў год). Зараз французы, якія зарабляюць у год больш за 500 тысяч еўра, будуць плаціць 3-працэнтны падатак да таго часу, пакуль бюджэтны дэфіцыт краіны не скароціцца да запланаваных 3%. Павышэнне акцызаў на тытунь і алкаголь будзе адбывацца ў два этапы. Сёлета кошты на цыгарэты і тытунёвыя вырабы паднімуцца на 6%, у наступным годзе — яшчэ на 6%. Павышэнне цэн чакае нават салодкія газаваныя напоі.

### ЯНУКОВІЧ: БУДУЧЫНЯ УКРАІНЫ — У ЕЎРАСАЮЗЕ

**Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч у сваім артыкуле ў газеце The Wall Street Journal напісаў, што бачыць будучыню Украіны ў Еўрапейскім саюзе і плануе забяспечыць Украіне годнае месца сярод чальцоў ЕС.**

«Я веру, што будучыня Украіны — у Еўропе. Хоць наша гістарычная сувязь з Расіяй і ў далейшым будзе адыгрываць значную ролю, ключ да росквіту нашага народа і развіцця нашых прыродных і чалавечых рэсурсаў — у глыбокай, больш дасканалай інтэграцыі ў еўрапейскія і заходнія структуры», — падкрэсліў Януковіч і дадаў: «Украіна пераадолела доўгі шлях, вызваляючыся ад рэштак савецкага багажу, і я планую весці краіну далей. Мая мэта — забяспечыць Украіне годнае месца сярод чальцоў Еўрапейскага саюза». Прэзідэнт адзначыў, што ў перспектыве Украіна зойме годнае месца ў еўрапейскай эканоміцы і згуляе ролю «мастка», які злучае еўрапейскі, расійскі і азіяцкі рынкі. У той жа час Віктар Януковіч падкрэсліў неабходнасць паляпшэння адносін з Расіяй.

### АМЕРЫКАНСКІ АГЕНТ-ЗАБОЙЦА ЧЭ ГЕВАРЫ АТРЫМАЕ КАМПЕНСАЦЫЮ Ў АМАЛЬ ТРЫ МІЛЬЯРДЫ ДОЛАРАЎ

**70-гадовы эмігрант з Кубы Густава Віёльда дамогся права на рэкордную кампенсацыю ад урада Вострава Свабоды. Сума ў 2,8 мільярда долараў павінна быць выплачана яму па грамадзянскім іску за разбураную рэвалюцыяй 1959 года сям'ю і страчаную спадчыну, перадае агенцтва Notimex.**

Віёльда быў агентам ЦРУ, браў удзел у аперацыі па захопе ў Балівіі ў кастрычніку 1967 года славутага рэвалюцыянера Эрнэста Чэ Гевары, які, як вядома, быў забіты. Мяркуецца, што названая сума можа быць выплачана заяўніку з замарожаных у ЗША кубінскіх рахункаў ці за кошт накладання арышту на тую ці іншую маёмасць або бізнэс, якія належаць кубінскім уладам ці прадпрымальнікам за мяжой.

### НАВУКОЎЦЫ: ПАРАЗІТ ЗАНЯВОЛЬВАЕ ЛЮДЗЕЙ, РОБЯЧЫ ІХ СЛУГАМІ ЧАЦВЕРАНОГІХ

**Новае даследаванне, прысвечанае вывучэнню асаблівасцяў паразіта Toxoplasma gondii, які размнажаецца ў арганізме кошак, у чарговы раз пацвердзіла, што гэта жывёла становіцца прывабнай у вачах заражанай інфекцыяй істоты. Раней гаворка ішла толькі пра мышэй і пацукоў, якіх паразіт літаральна пхаў у зубы котцы. Але зараз ёсць падазрэнні, што паталагічная любоў, якую адчуваюць некаторыя людзі да сваіх чацвераногіх любімцаў, магчыма, таксама тлумачыцца паразітарнай інфекцыяй.**

«Вы любіце кошак, таму што яны — прыгожыя, вытанчаныя істоты? Ці таму, што вы заражаны паразітам, які ўплывае на мозг?» — задаецца пытаннем часопіс Time. Падчас даследаванняў, праведзеных у мінулыя гады, было ўстаноўлена, што Toxoplasma gondii пры трапленні ў арганізм чалавека можа паўплываць на ўласцівасці асобы і нават стварыць пагрозу захворвання шызафрэніяй і паранояй. Гэтыя звесткі былі пацверджаны і новымі аналізамі.



## Извещение о проведении 26 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже имущества Белкоопсоюза

Минский городской центр недвижимости

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | - здание специализированное автомобильного транспорта (гараж) общей площадью 782 кв. м, инвентарный номер 500/С-42213;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад готовой продукции) общей площадью 4136,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-42208;<br>- здание специализированное растениеводства (теплицы) общей площадью 2839,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-45463;<br>- здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (здание «Ангар») общей площадью 430 кв. м, инвентарный номер 500/С-42210;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ общей площадью 73,4 кв. м, инвентарный номер 500/С-45471;<br>- здание специализированное иного назначения (контора строительного участка) общей площадью 77 кв. м, инвентарный номер 500/С-45472;<br>- здание специализированное иного назначения (цех для ремонта ящиков и бочек) общей площадью 475 кв. м, инвентарный номер 500/С-42209;<br>- здание специализированное иного назначения (банно-прачечный комплекс) общей площадью 259 кв. м, инвентарный номер 500/С-42207;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад товарный) общей площадью 363,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-45474;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад пиломатериалов) общей площадью 205,7 кв. м, инвентарный номер 500/С-45460;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (цех товаров народного потребления) общей площадью 145,2 кв. м, инвентарный номер 500/С-45459;<br>- здание специализированное иного назначения (весовая) общей площадью 26,1 кв. м, инвентарный номер 500/С-45457;<br>- здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (ангар) общей площадью 397 кв. м, инвентарный номер 500/С-45461;<br>- площадка с асфальтобетонным покрытием и фундаментом (площадь площадки – 2 500 кв. м);<br>- не завершенное строительством здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (спиртохранилище) общей площадью 146,1 кв. м, инвентарный номер 500/U-54924 |
| **Сведения о земельном участке** | Имущество, входящее в состав предмета торгов, расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000002005960 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168 |
| **Сведения о продавце** | ЧУП «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», 220075, проспект Партизанский, 168, г. Минск, телефон (017) 345 85 85 |
| **Сведения об организаторе аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 227 48 36 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 25 066 940 800 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 1 000 000 000 белорусских рублей |
| **Наличие обременений** | Аренда, залог |

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества Белкоопсоюза, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, осуществляется участником, выигравшим торги.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 20 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **26 сентября 2011 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 29.08.2011 по 23.09.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, (044) 547 54 44.**

**Сайт в интернете: www.mgcn.by**

Юры ГУРСКІ:

Дыскусійная трыбуна

## «ТРЭБА РАСТЛУМАЧЫЦЬ РАСІЙСКАМУ І ЗАХОДНЯМУ БІЗНЭСУ, ШТО БЕЛАРУСЬ У ПАРАЎНАННІ З РАСІЯЙ — ГЭТА АСТРАВОК ПАРАДКУ»

**Тэма прыцягнення замежных інвестараў у апошні час узнімаецца даволі часта і на розных узроўнях. Больш за ўсё пры гэтым гучыць слоў пра нашу перспектыўнасць і пра зацікаўленасць іншаземных кампаній укладваць грошы ў праекты ў Беларусі. А ці насамрэч гэта так? Ці ведаюць пра нашу перспектыўнасць інвестары? Пра гэта і іншае мы гутарым сёння з Юрыем ГУРСКІМ, выканаўчым дырэктарам кампаніі па распрацоўцы праграмнага забеспячэння «Viaden Media».**



— Галоўная праблема заключаецца ў заканадаўстве: калі параўноўваць наша заканадаўства з заканадаўствам краін Захаду, то яно цалкам не гатова і не прыстасавана для інвестыцый. Няма асноўных метадаў абароны інвестара, якія прапісаны, скажам, у Англіі ці ЗША. Гэта прыводзіць да таго, што ні замежны, ні беларускі інвестар не абаронены. Вядома, зараз адбываюцца некаторыя змены. Але яны, мякка кажучы, недастатковыя для таго, каб, па-першае, у краіне з'явіліся свае інвестары, а па-другое, каб прыйшлі заходнія інвестары. Бо калі яны пачынаюць бачыць розніцу паміж прынятымі нормамі ва ўсім свеце і нормамі, якія прыняты ў нас, то яны не бачаць ніякіх варыянтаў эканамічнага інвеставання ў краіну: інвестар абсалютна ніяк не абаронены.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2011 г. (для б/н разлікаў) | | Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ |
|---|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ....5 053,00 | 1 чэшская крона ....301,10 | USD ....28,8825 |
| ▲ 1 еўра ....7 308,15 | 1 польскі злоты ....1 753,72 | 10 UAH ....36,1054 |
| 1 латвійскі лат ....10 284,96 | ▲ 1 расійскі рубель ....174,95 | 10000 BYR ....57,2157 |
| 1 літоўскі літ ....2 113,43 | 1 украінская грыўня ....631,64 | EUR ....41,6746 |

# «...БЕЛАРУСЬ У ПАРАЎНАННІ З РАСІЯЙ — ГЭТА АСТРАВОК ПАРАДКУ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— А што вы маеце на ўвазе пад «абаронай»?***

— Што значыць не абаронены? Напрыклад, самая простая норма: калі ідуць інвестыцыі ў прадпрыемства і там застаецца працаваць стары дырэктар з нейкай доляй, то ў выпадку сыходу гэтага дырэктара з часткай калектыву яго доля павінна забірацца. Гэта цалкам добрая норма, якая абараняе інвестара ў пераходны перыяд. У Беларусі сёння такога няма, таму, укладваючы сродкі ў нейкае прадпрыемства, інвестар сутыкаецца з рызыкай, што пасля таго, як будуць заплачаны грошы, менеджмент або былыя ўладальнікі, якія з'яўляюцца менеджментам, пакінуць прадпрыемства. І пры гэтым у іх захаваецца доля і нават застаецца магчымасць выняць частку інвеставаных грошай. Ці вось яшчэ: дзяржава мае інструмент «залатой акцыі», які можа быць выкарыстаны амаль на любым прадпрыемстве. З пункту гледжання інвестара, гэта таксама вялізная рызыка магчымага фактычна рэйдарскага захопу з боку чыноўнікаў.

Наша заканадаўства не падобнае на заканадаўства развітых краін. Адпаведна, інвестар не разумее, як у гэтых правілах працаваць. Беларускім інвестарам трошкі прасцей, бо яны прывыклі да такой сітуацыі. Калі казаць асобна пра сферу інфармацыйных тэхналогій (IT), то ў нас існуюць падатковыя льготы ў Парку высокіх тэхналогій — гэта, бадай, самыя лепшыя ўмовы падатковага рэжыму ў Еўропе, а можа, нават ва ўсім цывілізаваным свеце. Але калі казаць увогуле, то зараз сітуацыя не вельмі добрая для развіцця інвестыцый у Беларусі. Чаму ў нас інвестыцыі прыходзяць у асноўным толькі з Расіі або з краін кшталту Кіпра ці Аўстрыі (апошнія насамрэч, як правіла, пераінвестыцыі беларускага бізнэсу праз афшорныя фірмы)? Таму, што калі заходні інвестар бачыць асаблівасці мясцовага заканадаўства і хуткасць яго змянення пад заходнія нормы, асаблівасці нашага бухгалтарскага ўліку, то ён ужо губляе жаданне нейкім чынам інвеставаць сюды грошы. Гэта, умоўна кажучы, як беларусу прапанаваць інвеставаць у Зімбабвэ: ён пачытае іх законы, убачыць, што яны не падобныя на тыя законы, да якіх ён прывык, паглядзіць на карупцыю, інфляцыю і гэтак далей — і ніякага жадання ў выніку інвеставаць не застанецца. Таму да нас прыходзяць або рускія інвестары, якія прывыклі працаваць у такой сітуацыі, або нашы ж грошы, якія перакачваюцца праз афшорныя фірмы і вяртаюцца ў краіну. Як такіх прамых замежных інвестараў вельмі і вельмі мала ва ўсіх галінах.

***— А што рабіць? Проста ўзяць заканадаўства (скажам, ЗША) і перанесці на нашу глебу?***

— Трэба працаваць з міжнароднымі арганізацыямі накшталт Сусветнага банка па адаптацыі заканадаўства пад міжнародныя нормы. Так зрабіла Эстонія яшчэ ў 90-я гады і зараз яна па ўсіх рэйтынгах лёгкасці вядзення бізнэсу знаходзіцца ў лідзіруючых пазіцыях, нягледзячы на свае дэмаграфічныя праблемы. Такім чынам, ніякіх глабальных праблем няма, ёсць людзі, якія могуць усё перапісаць і наладзіць, ёсць схемы, якія добра працуюць. Але, на жаль, вельмі шмат людзей у гэтым не зацікаўлена. Яны нядрэнна будуюць сваё жыццё на тым, што краіна з'яўляецца закрытай. Таму, нягледзячы на тое, што тэхнічнай складанасці перарабіць заканадаўства няма, пакуль рух у гэтым напрамку вельмі павольны. Калі мы будзем рухацца з такой хуткасцю, то ні пра якія сур'ёзныя інвестыцыі ў бліжэйшыя 10-15 гадоў можна нават і не думаць.

***— А якія сферы ў нашай эканоміцы могуць быць цікавымі для нашага або замежнага інвестара?***

— Самае галоўнае — зараз ёсць Мытны саюз Расіі, Беларусі і Казахстана. Калі б наша краіна гэты момант зараз выкарыстала эфектыўна і хутка, то мы б мелі проста вал інвестыцый. Таму што, маючы тут вытворчасць, можна працаваць на вялізны расійскі рынак, які зараз жудасна карумпаваны. Напрыклад, у мяне сябры адкрывалі прадпрыемства ў Расіі, і толькі вырашэнне праблемы з падключэннем электрычнасці і газу каштавала ім некалькі гадоў жыцця і некалькі мільёнаў долараў. Я мяркую, што было б дастаткова пабудаваць больш-менш празрыстую і зразумелую сістэму для інвестараў, растлумачыць, што яны змогуць фактычна ў адкрытую працаваць на вялізным расійскі рынку. І тады рускія бізнэсмены, якія стаміліся ад анархіі ў Расіі, пачалі б сюды пераносіць свае прадпрыемствы. А за імі сталі б прыходзіць і заходнія карпарацыі, якія стаміліся ад шматмільённых хабараў, ад складанасцяў у вырашэнні любога пытання ў Расіі.

***— Але, відаць, да замежнага бізнэсу трэба будзе яшчэ неяк і данесці гэтую інфармацыю...***

— Сапраўды, Беларусь зараз моцна прайграе ў піяры. Калі набраць Беларусь у Гугле, то нічога добрага прачытаць не зможам. Калі пачытаць газеты — то там карцінка яшчэ горшая. Але гэта няпраўда: наша кампанія працуе з 80 краінамі свету, і мы бачым, што, па вялікім рахунку, сітуацыя паўсюль большменш роўная, калі не браць 10-12 краін-лідараў. Мы не маем вельмі дрэннай сітуацыі ні ў чым. Але ўсе астатнія краіны вельмі актыўна займаюцца піярам. Гэтым займаюцца спецыяльныя нанятыя фірмы, спецыяльныя міністэрствы, іх чыноўнікі ведаюць англійскую мову. А што ў нас? Нават калі прыедзе нейкі вельмі добры інвестар, то як толькі ён убачыць, што міністр або яго намеснік не ведае англійскай мовы нават на ўзроўні «добры дзень/да пабачэння», то на гэтым яго жаданне інвеставаць скончыцца. Бо гэта нонсэнс у сучасным свеце, калі член урада не ведае мовы міжнародных зносін.

Вяртаючыся да вашага пытання: нам трэба ствараць у рамках гэтага Мытнага саюза максімальна чыстыя законы, максімальна чыстыя ад карупцыі ўмовы і максімальна «піярыць» гэта на Расію і на тыя краіны, якія хочуць працаваць на Расію. І не прынцыпова, у якіх галінах. Галоўнае, што ў нас ёсць вялізны рынак Мытнага саюза, і на аснове таго беспарадку, які сёння ў Расіі, мы можам больш прывабна выглядаць. Трэба растлумачыць расійскаму і заходняму бізнэсу, што Беларусь у параўнанні з Расіяй — гэта астравок парадку, дзе вы можаце не мець праблем і зарабляць у Расіі. Вось на гэтым і трэба будаваць кропку росту эканомікі.

***— Вы працуеце ў галіне інфармацыйных тэхналогій — наколькі я зразумеў, тут сітуацыя трохі лепшая?***

— Калі ж казаць асобна пра IT, то я мяркую, што тут усё добра. Гэтая галіна налічвае ўсяго якіх-небудзь 10 тысяч чалавек, але пры гэтым прыносіць сотні мільёнаў долараў чыстай валюты ў краіну, з'яўляецца фактычна чыста экспартнай і не мае ніякага імпарту. Адзіная тут праблема — недахоп людзей. Сістэма адукацыі з'яўляецца вельмі праблемнай, яна не адпавядае патрэбам рэальнай эканомікі: выпускаецца вялікая колькасць незапатрабаваных спецыялістаў, адукацыйныя сістэмы, распрацаваныя яшчэ ў савецкі час, не адаптаваны пад сучасныя патрэбы — фактычна спецыялісты давучваюцца на сваім першым месцы працы. І гэта ўсё нягледзячы на тое, што мы зараз плацім прагамісту 2500-3000 долараў — гэта ў дзесяць разоў перавышае сярэднюю зарплату маладога спецыяліста. І я не бачу ў той жа радыётэхнічны ўніверсітэт нейкага вялікага конкурсу з боку беларускіх геніяў. Я рэгулярна ўключаю навіны і чамусьці не чую інфармацыі пра тое, што ў Беларусі чалавек можа зарабляць 2,5 тысячы долараў, працуючы прагамістам. Мне паказваюць ферму, мне паказваюць завод, але чамусьці бацькі таленавітых дзяцей, у тым ліку і з правінцыі, не чуюць пра галіну, дзе можна зарабляць шмат.

У нас ёсць вельмі шмат кропак росту, але мы чамусьці зацыкліліся на нейкіх сваіх уяўленнях пра жыццё часоў сярэдзіны 90-х. Зараз усё змянілася, і мяняецца кожны дзень, але пры гэтым чамусьці бацькі аддаюць сваіх дзяцей вучыцца на юрыстаў, эканамістаў — на тыя прафесіі, якія фактычна гарантуюць людзям «галоднае» жыццё. Замест таго, каб чалавека, які мае здольнасці ў матэматыцы, аддаць на прагаміста; чалавека, які мае здольнасці маляваць, — на дызайнера і г.д.

Насамрэч галіна IT — гэта прыклад, як дзяржава павінна была сябе весці паўсюль. Дзяржава стварыла Парк высокіх тэхналогій, сэнс якога быў вельмі просты: працуйце і вам замінаць ніхто не будзе. Парку сёння 5 гадоў, і вынік насамрэч вельмі добры. У прынцыпе, падобная ідэя павінна быць ва ўсёй дзяржаве: уся краіна павінна быць фактычна свабоднай эканамічнай зонай. Гэта вельмі добрая ідэя ў рамках Мытнага саюза: калі атрымаецца стварыць чыстую схему працы, перш за ўсё заканадаўчую, перш за ўсё з кропкі гледжання стасункаў з дзяржавай, і растлумачыць, што вы можаце працаваць у Беларусі, а прадаваць на Расію і Казахстан, то нас чакае вельмі добры прыток інвестыцый. Але гэта пытанне заканадаўчае, пытанне волі дзяржавы і пытанне піяру. Бо можна зрабіць усё што заўгодна, але калі гэтая інфармацыя не будзе данесена да патэнцыйных інвестараў, то сэнсу ніякага не будзе. А мы, я лічу, не ўмеем працаваць з пункту гледжання краінавага піяру. Бо калі ўключыць, напрыклад, CNN, то можна ўбачыць, як актыўна тая ж Грузія ці Арменія займаецца краінавым піярам. Мы сябе ўспрымаем ледзьве не пупам зямлі і цэнтрам Еўропы, але насамрэч нават для немца ці амерыканца мы як Зімбабвэ...

***— Зноў вернемся да тэмы IT: можа, нашай краіне зрабіць стаўку на інфармацыйныя тэхналогіі і зарабляць на гэтым?***

— Ключавая праблема — у людзях. Каб зрабіць такую стаўку, трэба 20 гадоў. А грошы нам патрэбны зараз. Адпаведна, я мяркую, развіваць як адну з галін — так, гэта мае сэнс. Але трэба разумець, што зараз любы бізнэс, па сутнасці, звязаны з IT. Бо калі ў краіне няма магутнага IT-кластэру, то ніводны бізнэс не можа развівацца: той жа самы сучасны трактар мае ўнутры дастаткова магутны праграмны комплекс. Адпаведна, калі развіваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, то ствараецца плацдарм для развіцця ўсяго астатняга.

***— Як мяркуеце, венчурныя інвестыцыі маюць перспектыву ў Беларусі?***

— Ключавая праблема тут — зноў жа заканадаўства. Напрыклад, пакуль у нас, у прынцыпе, немагчыма стварыць венчурны фонд у тым разуменні, у якім ён існуе на Захадзе. Вядома, яго можна стварыць за мяжой, але гэта вельмі дрэнна для краіны — фактычна гэта ўжо будзе не беларускі венчурны фонд. Калі казаць пра прамое інвеставанне, то яно ёсць, але ў асноўным людзі давяраюць і інвестуюць у тыя праекты, якія запускае нехта ім добра знаёмы. Бо з-за таго, згодна з дзейным заканадаўствам, інвестар не з'яўляецца абароненым, рызыка даць грошы абсалютна пабочнай асобе вельмі высокая. Такім чынам, мы пакуль знаходзімся ў самым-самым зародкавым стане. І калі не адбудуцца нейкія істотныя змены ў заканадаўстве, то мы ў гэтым стане і застанемся на дастаткова працяглы прамежак часу. Бо бізнэс пачынаецца і заканчваецца з законаў: калі гэта бізнэс сур'ёзны і не крымінальны, то ён не будзе займацца сумнеўнымі схемамі.

Акрамя таго, што мы чакаем нейкіх рухаў з боку дзяржавы, наша кампанія таксама падрыхтавала пакет прапаноў для Парка высокіх тэхналогій наконт змен у заканадаўстве для таго, каб да нас прыйшлі інвестыцыі. Мы будзем больш праяўляць актыўнасць, каб дапамагчы дзяржаве сфарміраваць тыя законы, якія сапраўды дапамогуць і нам, як айчыннаму бізнэсу, і дапамогуць прыцягнуць новых інвестараў.

**Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.**

## КОРСАК НАМАЛАЦІЎ 5 ТЫСЯЧ ТОН ЗБОЖЖА

**Камбайнер агракамбіната «Зара» Магілёўскага раёна Уладзімір Корсак намалаціў 5 тысяч тон збожжа! Гэта рэкорд для Магілёўскай вобласці. Корсак, як і летась, мае ўсе шанцы стаць пераможцам спаборніцтва ў краіне.**

Між тым, жніво ў рэгіёне завяршаецца. Убрана ўжо 97% пасяўных плошчаў. Да канца гэтага тыдня, калі не будзе пагодных сюрпрызаў, аграрыі Магілёўшчыны плануюць завяршыць кампанію па ўборцы збожжавых.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «ШЭРЫЯ» СХЕМЫ АРЭНДЫ КВАТЭР ЦЯГНУЦЬ НА МІЛЬЁНЫ ШТРАФАЎ

**Сёлета за сем месяцаў 8741 уладальнік кватэр здаваў у арэнду ўласнае жыллё, пасля чаго ў бюджэт Віцебскай вобласці было накіравана 975,6 млн рублёў падаходнага падатку, паведамілі рэдакцыі ў прэсцэнтры Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.**

Спецыялісты адзначаюць, што на Віцебшчыне колькасць «правільных» кватэраздатчыкаў цяпер павялічылася, у параўнанні з мінулагоднім адпаведным перыядам, ажно на 1707 чалавек.

Аднак кантрольнымі мерапрыемствамі было выяўлена, што яшчэ не ўсе грамадзяне згодны займацца здачай жылля па законе. Сёлета з пачатку года ў гэтым рэгіёне «злавілі» 158 грамадзян, якія памяшканні ў арэнду здавалі, а вось падатак у фіксаваных сумах не плацілі. Паводле вынікаў спецыяльных праверак, гэтыя парушальнікі заканадаўства заплацілі падаходны падатак, пеню і штраф на суму 28,4 млн рублёў.

Паводле інфармацыі начальніка сталічнай інспекцыі МПЗ Уладзіміра Лайкова, на пачатак ліпеня ў сталіцы было зарэгістравана 31 500 мінчан, якія спраўна плацяць падаходныя падаткі з даходаў ад здачы жылля ў наём.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ФРАНЦУЗСКАЯ РОЗНІЧНАЯ ГАНДЛЁВАЯ СЕТКА CARREFOUR МОЖА ПРЫЙСЦІ Ў МІНСК

Крамы пад маркамі, якія належаць Carrefour, працуюць у Францыі, Іспаніі, краінах Лацінскай Амерыкі і Блізкага Усходу. Прынцып сеткі: рэалізацыя 80% айчыннай прадукцыі і 20% імпарту.

**Наталля ВАВІЛАВА,**
*«Мінск—Навіны».*

## ВУЧНІ ПЕРШЫХ КЛАСАЎ АТРЫМАЮЦЬ ЭЛЕКТРОННАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ ЎРОКА «ЧАЛАВЕК І СВЕТ»

**СЁЛЕТА вучні першых класаў на ўроках «Чалавек і свет» атрымалі магчымасць займацца з дадатковым электронным дапаможнікам. Ён суправаджае кнігу «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку». Дыск не дублюе кнігу, а змяшчае дадатковыя матэрыялы, прычым зроблены ён у інтэрактыўнай форме, што дае магчымасць дзецям засвойваць інфармацыю ў выглядзе гульняў і заданняў. Як падкрэсліў намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак, электронныя дапаможнікі, якія з'яўляюцца па некаторых дысцыплінах, ні ў якім разе не ставяць за мэту замяніць падручнікі, яны існуюць побач.**

Як паведаміў начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Юрый Гладкоў, з 2011—2012 навучальнага года будзе пашырана безадзнакавае навучанне па шэрагу дысцыплін. Каля трох гадоў вёўся эксперымент, у выніку якога вырашана не ацэньваць вучняў трэціх класаў па такіх дысцыплінах, як «Музыка і спевы», «Выяўленчае мастацтва», «Працоўнае навучанне» і «Фізічная культура». Пасля гэты эксперымент пашырыцца і на чацвёртыя класы.

Юрый Гладкоў нагадаў, што па прагнозных паказчыках сёлета будзе зачынена каля 70 агульнаадукацыйных школ, у асноўным сельскіх. 1 верасня ўрачыста адчыніцца 7 новых школ, пабудаваных у асноўным у новых густанаселеных гарадскіх мікрараёнах (у Мінску гэта школы ў мікрараёнах «Дружба-2» і «Каменная горка»). Колькасць першакласнікаў у гэтым навучальным годзе вырасце прыкладна на 1,5 тысячы, і гэтае павелічэнне назіраецца некалькі апошніх гадоў. Але агульная колькасць вучняў штогод змяншаецца, і такая тэндэнцыя будзе характэрная ў бліжэйшыя тры гады.

Юрый Гладкоў сказаў, што харчаванне сёлета істотна не зменіцца: «Мы пастараемся карміць дзяцей гэтак жа добра, як і раней». Што датычыць кошту абедаў, то ён, паводле слоў чыноўніка, не перавысіць загадзя прадугледжаных цэн, якія рэгулююцца арганізатарамі харчавання.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

### Рэверс з сеціва

## Абыякавасці да лёсу простага настаўніка даравацьне магу

**Не раз гучалі такія словы: «Міністэрства адукацыі не прымушае настаўнікаў пісаць столькі лішніх папер — гэта ініцыятыва раённых аддзелаў». Добра, што не прымушае, але ж і не забараняе, зрэшты! Таму раённыя кіраўнікі асветы, арыентуючыся на даволі паблажлівае (ці я памыляюся?) маўчанне вышэйшых інстанцый, працягваюць гнуць ранейшую лінію. У што гэта выліваецца на месцах, добра відаць са скаргаў настаўніцтва.**

Але яшчэ горш, калі некаторыя амбіцыйныя начальнікі раённых аддзелаў адукацыі бяруць на сябе павышаныя абавязацельствы, дадатковыя (і, бачыць Бог, абсалютна не патрэбныя школе!) нагрузкі. Разлік просты: вобласць абавязкова заўважыць цікавую ініцыятыву, а справа аддзела — толькі строга пракантраляваць. Падумаеш, падначаленыя зноў ноч-другую не выспяцца... Не страшна... А паскардзішся — скаргу вернуць у раён.

Абыякавасць да лёсу простага настаўніка з боку адказных за яго абарону і дабрабыт уражвае моцна і непрыемна. Адліга надыходзіць толькі падчас падобных публічных дыскусій. Несправядлівасць баіцца агалоскі. За сябе надта не турбуюся — жыццё развіла здаровы сэнс і загартавала нервы, але не магу прыняць жаночых пакутаў. Без пары губляюць здароўе і прыгажосць, страчваюць сем'і, бо сумленна выконваюць усе даручэнні адміністрацыі і проста таму, што баяцца дырэктарскіх разносаў. Не магу прыняць і, прабачце, дараваць таксама не магу...

**Базыль.**

### Абзац

◢ **У Мінску памер аднаразовай грашовай дапамогі на закупку сельгаспрадукцыі асобным катэгорыям мінчан прапаноўваецца павялічыць удвая: з 3 да 6 базавых велічынь (адна базавая велічыня роўная Br35 тыс.). Такую дапамогу атрымаюць малазабяспечаныя мінчане, прыбытак якіх ніжэйшы за бюджэт пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (Br442 тыс. 360), усяго каля 47,7 тыс. чалавек. Канчатковае рашэнне па выплаце аднačасовай грашовай дапамогі будзе прынятае на сесіі Мінгарсавета, правядзенне якой запланавана на 2 верасня.**

◢ Супрацоўнікі галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй спынілі грузавы аўтамабіль на пасту збірання дарожных збораў «Радзькі» (мяжа Беларусі і Расіі). У накладных, якія прад'явіў кіроўца, значылася, што ён вязе з Мінска ў Цвер угнаенне, але на самай справе ў машыне было 20 т цукру коштам Br92 млн. Мяркуецца, што нелегальны груз дастаўляўся ў Маскву. У той жа дзень намеснік дырэктара адной з фірмаў вырашыў даць хабар супрацоўніку органаў унутраных спраў у памеры $8 тыс., каб вярнуць нелегальны груз, але быў затрыманы.

◢ **У Беларусі затрыманы 61-гадовы грамадзянін Таджыкістана, які з красавіка 1994 года знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку па ініцыятыве МУС Расійскай Федэрацыі. Праваахоўнікі з суседняй краіны вінавацяць мужчыну ў махлярстве ў буйным памеры. Таджыкскі грамадзянін быў затрыманы міліцыянерам патрульна-паставой службы Асіповіцкага АУС на транспарце ў дызель-цягніку Жлобін—Асіпавічы. Мужчына ўжо некалькі гадоў жыў у Рэчыцы без дакументаў, якія сведчаць асобу, і рэгулярна займаўся разавымі заробкамі.**

◢ Чэмпіянат Беларусі па спа-масажы пройдзе ў Мінску 3 верасня. Падобнага роду мерапрыемства раней не праводзілася ў Беларусі. Спаборніцтва адбудзецца ў два этапы: паўфінал, дзе ўдзельнікі прадэманструюць навыкі «класічнай» тэхнікі масажу, і фінал — з дэманстрацыяй методыкі спа-масажу.

◢ **Новы пункт пропуску «Дамачава» на беларуска-польскай мяжы адкрыецца 20 верасня. Яго прапускная здольнасць складзе 2,5 тыс. транспартных сродкаў у суткі. Пункт пропуску «Дамачава» размешчаны ў 45 км ад Брэста. Праз яго будуць праязджаць грамадзяне, а таксама транспартныя сродкі грузападымальнасцю 3,5 т, пасажырскія мікрааўтобусы ўмяшчальнасцю да 9 чалавек.**

◢ У Гродзенскай вобласці будуць гадаваць фазанаў для палявання. Упершыню ў рэгіёне фазанарый створаны ў падшэфнай гаспадарцы «Парэчанка» ААТ «Гродзенскі мясакамбінат». Пад фазанарый перабудавалі старую ферму, у яе ўжо пасялілі рэдкіх птушак. Партыю фазанаў у 2 тыс. галоў, з якіх каля 80% — дарослыя птушкі, Гродзенскі мясакамбінат закупіў у Польшчы. Птушку будуць гадаваць у першую чаргу для арганізацыі палявання, таксама далікатэснае мяса будуць пастаўляць мясцовым рэстаратарам. Паляванне на фазанаў плануецца адкрыць ужо ў кастрычніку. Тэрміны і ўмовы яго правядзення будуць вызначаныя сумесна з Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў. Чакаецца, што кошт кожнага трафея складзе да 10 еўра.



◢ **Брытанскія даследчыкі распрацавалі метад аднаўлення пашкоджаных карыесам зубоў, які не патрабуе свідравання і пламбавання. Для гэтага яны выкарысталі раствор на аснове пептыду Р 11-4, які пры пэўных умовах фарміруе валокны, якія абсарбіруюць іёны кальцыя. Пры нанясенні раствору на зуб з карыесным працэсам, які толькі пачынаецца, Р 11-4 пранікае ў мікрапоры зубной тканкі, аднаўляючы яе.**

### Поўны абзац

◢ У горадзе Олбані, штат Джорджыя, сабака па мянушцы Мядовая Булка з'еў некалькі брыльянтаў на агульную суму дзесяць тысяч долараў. Інцыдэнт адбыўся каля двух тыдняў назад у ювелірнай краме, якая належыць гаспадару сабакі. Брыльянты выйшлі з арганізма сабакі на наступны дзень натуральным шляхам.

◢ **Шведскі пенсіянер Эскіль Карлсан пачаставаў гасцей ялавічынай, якая была нарыхтавана яго сваякамі ў пачатку Другой сусветнай вайны. Па іх словах, непрыемнага паху ад тушонкі не зыходзіла. Яна наогул моцна не пахла. Як распавёў пенсіянер, мяса было такім, як быццам яго прыгатавалі на гэтым тыдні.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

г. Клецк

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

27 сентября 2011 года

| № лота | Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель | Вид аукциона | Характеристика инженерных коммуникаций | Площадь земельного участка, га | Срок аренды, лет | Назначение участка | Условия продажи | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, г. Клецк, ул. Веселая; кадастровый номер 622550100002002992; арендодатель – Клецкий райисполком | на право заключения договора аренды | водопровод, электроснабжение; газопровод, ограничений в использовании не имеется | 0,0255 | 20 | для размещения объектов розничной торговли (строительство магазина) | - заключение победителем аукциона с Клецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки технической документации и разрешения на строительство магазина в срок, не превышающий 2 года;<br>- занятие земельного участка не позднее 6 мес. после получения свидетельства о гос. регистрации;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 2 226 609 | 222 660 | 3 255 240 |
| 2 | Минская область, г. Клецк, ул. Победоносная; кадастровый номер 622550100002002990 | на право заключения договора аренды | водопровод, газопровод, электроснабжение, канализация; ограничение в использовании в соответствии с Правилами охраны электрических сетей напряжением до 10000 вольт, утвержденных Постановлением Совета Министров РБ от 19.08.2006 г. | 0,0327 | 20 | для размещения объектов розничной торговли (строительство магазина) | - заключение победителем аукциона с Клецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки технической документации и разрешения на строительство магазина в срок, не превышающий 2 года;<br>- возмещение потерь сельхозпроизводства в сумме 718010 руб.;<br>- занятие земельного участка не позднее 6 мес. после получения свидетельства о гос. регистрации;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 2 596 126 | 259 610 | 3 246 204 |
| 3 | Минская область, г. Клецк, ул. Советская; кадастровый номер 622550100002002989 | на право заключения договора аренды | водопровод, газопровод, электроснабжение, канализация; имеется ограничение в использовании в связи с расположением земельного участка в охранной зоне систем газоснабжения | 0,3541 | 20 | для размещения объектов розничной торговли (строительство торгового центра) | - заключение победителем аукциона с Клецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки технической документации и разрешения на строительство магазина в срок, не превышающий 2 года;<br>- возмещение потерь сельхозпроизводства в сумме 31780710 руб.;<br>- занятие земельного участка не позднее 6 мес. после получения свидетельства о гос. регистрации | 38 804 544 | 3 880 450 | 3 267 080 |
| 4 | Минская область, Клецкий район, Краснозвёздовский сельсовет, аг. Яновичи, ул. Гагарина; кадастровый номер 622580403601000235 | на право заключения договора аренды | водопровод, газопровод, электроснабжение | 0,0120 | 20 | для размещения объекта розничной торговли (для установки торгового павильона) | - заключение победителем аукциона с Клецким райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации прав на земельный участок;<br>- получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ, разработки технической документации и разрешения на строительство в срок, не превышающий 2 года;<br>- занятие земельного участка не позднее 6 мес. после получения свидетельства о гос. регистрации;<br>- осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией | 591 850 | 59 185 | 2 342 301 |

1. Аукцион состоится **27 сентября 2011 г.** в 11 часов в здании Клецкого райисполкома по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, юридические лица, граждане Республики Беларусь.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников.

Участнику необходимо подать заявление в Клецкий райисполком.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителями индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализованную в установленном порядке доверенность; граждане РБ представляют копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 204; последний день приема документов **26 сентября 2011 г.** до 11.00. Заключительная регистрация участников **27 сентября** с 10.00 до 10.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3642207430706 в ЦБУ № 607 г. Клецк филиала № 620 г. Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Клецка, код 523. Получатель – Клецкий райисполком, УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее, чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка внести плату за предмет аукциона, возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона; внести плату на право заключения договора аренды земельного участка или плату за земельный участок.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомится с объектом продажи. Контактные телефоны в Клецке: **(8 01793), 54657, 50822, 54572** сайт **www. kletsk.minsk-region.by**

### Пытальнік

# «ЧАМУ МНЕ АДМОВІЛІ Ў ПРОДАЖЫ ВАЛЮТЫ НА САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНЫЯ ПАТРЭБЫ?»

***У газеце «Звязда» № 142 ад 29.07.2011 у артыкуле «Урад перакананы: цяжкасці на валютным рынку Беларусі часовыя», у самым канцы, ёсць словы Надзеі Ермаковай (гаворка ідзе пра «Беларусбанк»): «Калі, напрыклад, чалавеку патрэбны грошы на водпуск, трэба прад'явіць копію білетаў, што яны сапраўды ёсць, валюту той краіны яму і прададуць». Звяртаю ўвагу: гаворка ідзе толькі пра білеты — і ўсё! Ні пра якія іншыя дакументы не сказана, іншымі словамі, больш нічога і не трэба прад'яўляць.***

***11.08.2011 я напісаў заяву ў філіял № 529 «Беларусбанка» з просьбай прадаць мне 3 000 рублёў РФ (смешна! — нейкіх 100 долараў) для паездкі ў Расію да вельмі пажылога роднага, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, і прыклаў копію чыгуначных білетаў у Санкт-Пецярбург (туды — 6.09.2011, назад — 17.09.2011). Мне было адмоўлена, паколькі прычына недастаткова «важкая».***

***Пераканаўча прашу вас узняць пытанне ў Нацбанку: чаму ў філіяле № 529 «Беларусбанка» ігнаруюць вышэйпрыведзенае ўказанне главы Нацбанка? Адгаворкі кшталту «ну, маецца на ўвазе, што на водпуск, калі для лячэння» мной катэгарычна не прымаюцца, паколькі «Звязда» — орган Вярхоўнага Савета і Саўміна і надрукаванае павінна трактавацца літаральна так, як напісана, а не так, як захацелася асобнаму работніку «Беларусбанка». А інакш чаго будуць каштаваць заявы службовых асоб, калі кожны клерк будзе трактаваць сказанае па-свойму?***

***Калі ўсё ж інфармацыя, надрукаваная ў № 142 ад 29.07.2011 не адпавядае рэчаіснасці, прашу (са згоды главы Нацбанка) надрукаваць абвяржэнне.***

**Уладзімір НАВУМЕНКАЎ,** *г.Мінск*

Напачатку невялікая рэмарка наконт згаданага матэрыялу. У любой газеце друкуюцца артыкулы штатных і нештатных супрацоўнікаў, паведамленні прэс-службаў міністэрстваў, ведамстваў, матэрыялы інфармацыйных агенцтваў (а артыкул якраз і быў атрыманы ад інфармацыйнага агенцтва БЕЛТА). Што датычыцца апошніх, менавіта яны нясуць адказнасць за выкладзеныя звесткі, рэдакцыі іх правяраць няма патрэбы і магчымасці. Выпраўленай можа быць толькі грубая, відавочная памылка. Ці была яна ў апісаным выпадку?

Пра тое, што набытая замежная валюта будзе накіроўвацца банкам на продаж насельніцтву для аплаты ім сацыяльна значных патрэб, а менавіта — лячэнне за мяжой, пражыванне і навучанне студэнтаў за мяжой, у сувязі з хваробай ці смерцю роднага чалавека — перад тым гаварылася даволі шмат. Настолькі шмат, што паўтараць гэта ў чарговы раз, падаецца, не было патрэбы — і без удакладнення ўсё зразумела. Гэта тое самае, што даваць нейкую інфармацыю са спасылкай на пэўны закон ці ўказ: калі гаворка ідзе пра адзін і той жа дакумент, дастаткова напачатку даць яго поўную назву, нумар, дату прыняцця ці ўступлення ў сілу, а потым проста згадваць — «закон», «указ», а не пісаць кожны раз грувасткую назву. Зразумела ж, пра што размова. Трэба яшчэ дадаць, што ёсць журналісцкі матэрыял (як у нашым выпадку), дзе інфармацыя будзе пададзена простай мовай, а ёсць тэкст афіцыйнага дакумента...

Цяпер да сутнасці скаргі. Мы аператыўна звязаліся з кіраўніцтвам філіяла № 529. Так жа аператыўна адгукнулася прэс-служба ААТ «ААБ Беларусбанк», перадаўшы ў рэдакцыю ксеракопіі заявы чытача на куплю валюты, чыгуначных білетаў і афіцыйнага адказу яму са згаданага філіяла. У апошнім, у прыватнасці, гаворыцца, што «заява ў адрас кіраўніцтва філіяла № 529 ААТ «ААБ Беларусбанк» разгледжаная. Улічваючы, што мэта, указаная ў вашай заяве на набыццё замежнай валюты для здзяйснення сацыяльна значных выдаткаў за межамі Рэспублікі Беларусь не пацверджана вамі дакументальна, у задавальненні вашай просьбы адмоўлена, з магчымасцю паўторнага звароту пры наяўнасці пацвярджальных дакументаў». Магчыма, у чытача выклікала пэўнае здзіўленне гэта агульнае словазлучэнне — «пацвярджальных дакументаў»? Якіх канкрэтна?

— Зразумейце, што нейкага адзінага пераліку няма, кожная сітуацыя разглядаецца асобна. Людзі ж звяртаюцца з рознымі жыццёвымі праблемамі, — па нашай просьбе скаргу чытача дадаткова пракаментавала **выканаўца абавязкаў дырэктара філіяла № 529 Вольга ГЛУШАКОВА**. — Проста прыйсці і пакінуць заяву, як зрабіў ваш чытач, недастаткова, трэба, напрыклад, пацвердзіць ступень роднасці. Дастаткова часта заяўнікі пішуць, што едуць праведаць састарэлых бацькоў 1927-1934 гадоў нараджэння. Увогуле, па заканадаўстве, блізкімі роднымі лічацца бабуля з дзядулем, бацькі і дзеці. Калі патрэбны грошы на лячэнне ці догляд хворага блізкага чалавека, можна прадставіць эпікрыз. У нас, скажам, быў выпадак, калі патрэбны былі сродкі на аплату сядзелкі. Бывае, што пажылы чалавек — адзінокі, яму патрэбна дапамога. У такіх выпадках таксама трэба прадаставіць дакументы: за такім чалавекам, як правіла, замацаваны сацыяльны работнік і той можа дапамагчы атрымаць адпаведную даведку. Ці вось яшчэ выпадак: у жанчыны за межамі Беларусі забралі дзіця. Ёй трэба было даваць грошы на яго ўтрыманне, каб не абвінавацілі ў тым, што яна не ўдзельнічае ў яго выхаванні, бо яна была цвёрда намерана адстойваць свае правы праз суд, змагацца за сваё дзіця. А іншыя заяўнікі — маладая дзяўчына са сваім хлопцам — указалі ў якасці прычыны, па якой ім патрэбна была замежная валюта, жаданне здзейсніць падарожжа па Еўропе. Ім было адмоўлена, прычым, без прапановы звяртацца паўторна, як вашаму чытачу: падарожжы дзеля адпачынку не з'яўляюцца сацыяльна значнымі патрэбамі. Мы невыпадкова далі адказ заяўніку, што ў яго ёсць права звярнуцца з заявай адносна продажу валюты яшчэ раз, але — прадаставіўшы пры гэтым пацвярджальныя дакументы.

